# ЯК СВЯТА




## Прыклад грамадзянскай свядомасці

### Ліноўскую выбарчую камісію складаюць аўтарытэтныя вяскоўцы

У Ліноўскім сельсавеце Пружанскага раёна створаны тры выбарчыя ўчасткі. Самы буйны — у аграгарадку Лінова, дзе пражываюць 1600 чалавек. Паводле інфармацыі **старшыні Ліноўскага сельскага Савета Таццяны МАРДАНЬ**, яшчэ ў сярэдзіне мінулага тыдня ўчасткі былі ў поўнай гатоўнасці да працэсу галасавання.

У гэтым змаглі ўпэўніцца **дэпутат Палаты прадстаўнікоў нашага парламента Юрый НАРКЕВІЧ** і **старшыня Пружанскага райсавета Мікалай КУДРАВЕЦ**, якія наведалі сельсавет. Дэпутаты правялі сустрэчу з працоўным калектывам ААТ «Ліноўскае», дзе абмеркавалі важнасць актыўнага ўдзелу грамадзян у выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Парламентарый Юрый Наркевіч засяродзіў увагу на значасці найважнейшай палітычнай падзеі, якая вызначае будучыню і кірунак развіцця любой суверэннай дзяржавы, а таксама заклікаў прыйсці на выбарчыя ўчасткі і выканаць свой грамадзянскі абавязак.

Старшыня раённага Савета дэпутатаў Мікалай Кудравец у сваёй гутарцы з працаўнікамі сельгаспрадпрыемства ўпор зрабіў на дасягненні раёна ў кантэксце развіцця краіны за апошнія тры дзесяцігоддзі.

Госці наведалі Ліноўскі выбарчы ўчастак, які размяшчаецца ў Доме культуры, пагаварылі з членамі камісіі, убачылі празрыстыя скрыні для галасавання, падрыхтаваныя кабінкі для выбаршчыкаў, адзначылі наяўнасць інфармацыйных матэрыялаў.

Старшыня Ліноўскага сельскага Савета Таццяна Мардань расказала карэспандэнту газеты, што ў склад Ліноўскай выбарчай камісіі ўваходзяць вядомыя і аўтарытэтныя ў асяродку вяскоўцаў людзі. Некаторыя маюць вялікі вопыт работы на выбарчых участках. Адна жанчына, напрыклад, працуе ў камісіях на працягу апошніх 30 гадоў.

— Па вопыце апошніх электаральных кампаній магу сказаць, што нашы людзі традыцыйна праяўляюць актыўнасць, — гаворыць



Таццяна Мікалаеўна. — Многія па розных прычынах ідуць, каб аддаць свой голас датэрмінова. Але ж асноўны дзень галасавання праходзіць у нас звычайна як свята. Мы загадзя рыхтуем канцэртную праграму, арганізоўваем работу буфета. Людзі, асабліва прадстаўнікі старэйшага пакалення, прыходзяць у гэты дзень на ўчасткі сем'ямі, прыводзяць унукаў, тым самым паказваюць прыклад грамадзянскай свядомасці. Выбаршчыкі не толькі выконваюць грамадзянскі абавязак, але сустракаюцца з аднавяскоўцамі, былымі калегамі, нешта набываюць у буфеце. У пералічаным праяўляецца савецкая традыцыя. А чаму б і не? Працэс галасавання можна арганізоўваць такім чынам, каб ён выклікаў пазітыўны настрой у людзей, — адзначыла старшыня сельскага Савета.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота з тэлеграм-канала Юрыя Наркевіча.**

## Камфортныя ўмовы для выбаршчыкаў

**Да важнай палітычнай падзеі ў Мсціслаўскім раёне падрыхтаваліся дэталёва, паведаміла старшыня Мсціслаўскага райсавета Алена КЛЕЯНКОВА.**

— Выбарчыя ўчасткі знаходзяцца ў традыцыйных і ўжо знаёмых для насельніцтва месцах: сельвыканкамах, установах адукацыі і культуры, — адзначыла яна. — Падрыхтоўкай іх займаліся на працягу года. Яшчэ да пачатку снежня адрамантавалі ганкі і цокалі Падсолтаўскага, Сапрынавіцкага сельсаветаў, дзе знаходзяцца выбарчыя ўчасткі. Дадаткова набывалі празрыстыя скрыні для датэрміновага галасавання, выпраўлялі дробныя няспраўнасці ў сістэмах водаадвядзення, добраўпарадкавалі пад'езды і пад'езды да выбарчых участкаў — зрабілі шмат рознай работы. Падчас выбараў некаторыя з раённых дэпутатаў будуць прысутнічаць на ўчастках у якасці назіральнікаў ад дэпутацкага корпуса, грамадскіх арганізацый, палітычных партый. Праведзена вялікая работа па інфармаванні насельніцтва. Па ініцыятыве дэпутатаў Мсціслаўскага райсавета ў раёне была арганізавана «Школа маладога выбаршчыка», праведзены сустрэчы з маладымі людзьмі, якія будуць галасаваць упершыню, і выбаршчыкамі да 31 года. З моладдзю сустракаліся асабіста старшыня райвыканкама, дэпутаты ўсіх узроўняў, пачынаючы ад райсавета і заканчваючы сельсаветамі. Расказвалі ім пра выбары, правы выбаршчыкаў, пра кандыдатаў.

У Магілёве ўсе арганізацыйныя пытанні цалкам вырашаныя — створаны камфортныя ўмовы для галасавання, запэўніў **старшыня Магілёўскага гарсавета Максім ГУРЫН**.

— У нас у горадзе зарэгістраваныя 147 выбарчых участкаў: 85 — у Ленінскім раёне і 62 — у Кастрычніцкім, — паведаміў дэпутат. — Усе яны ў поўнай гатоўнасці. Сёлета ўпершыню прыйдуць галасаваць 4219 маладых людзей. Мы з імі правялі вялікую работу: сустракаліся, тлумачылі, наколькі гэта вялікая адказнасць. Пераканаты, што выбары пройдуць на высокім узроўні.

За ходам выбарчай кампаніі ў Магілёве будуць сачыць акрэдытаваныя міжнародныя і нацыянальныя назіральнікі. Дэпутацкі корпус таксама гатовы ў рамках сваіх паўнамоцтваў падтрымліваць парадак на выбарчых участках, падстаўляць плячо выбарчым камісіям.

26 студзеня — гэта свята для краіны, для тых людзей, якія прыйдуць на выбары. Таму мы паклапаціліся, каб чалавек не толькі з годнасцю выканаў свой абавязак, але і адпачыў. На кожным выбарчым участку будуць выступаць творчыя гурты, будзе працаваць гандаль. З'явіцца магчымасць павесяліцца, атрымаць задавальненне ад стасункаў з іншымі людзьмі, абмеркаваць агульныя тэмы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**


### О ПОИСКЕ ПРАВООБЛАДАТЕЛЕЙ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

**д. Хватовка**
**Березинского района Минской области**

Погостский сельский исполнительный комитет в целях реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом: Минская область, Березинский район, д. Хватовка, ул. Центральная, д. 22 (полный адрес указан согласно похозяйственным книгам).

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках и лицах, имеющих право пользования жилым домом, о месте их фактического проживания, сообщить в Погостский сельисполком по телефонам: **801715 6 43 25, 801715 6 22 33, 801715 6 13 78 (с 08.00 до 17.00 по рабочим дням).** Также информацию можно прислать по адресу: **223320, Минская область, Березинский район, ул. Советская, 4. Электронный адрес: pogoctss@berezino.gov.by**

УНП 600092490

### О ПОИСКЕ ПРАВООБЛАДАТЕЛЕЙ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

**аг. Лешница**
**Березинского района Минской области**

Погостский сельский исполнительный комитет в целях реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом: Минская область, Березинский район, аг. Лешница, ул. Школьная, д. 71 (полный адрес указан согласно похозяйственным книгам).

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках и лицах, имеющих право пользования жилым домом, о месте их фактического проживания, сообщить в Погостский сельисполком по телефонам: **801715 6 43 25, 801715 6 22 33, 801715 6 13 78 (с 8.00 до 17.00 по рабочим дням).** Также информацию можно прислать по адресу: **223320, Минская область, Березинский район, ул. Советская, 4. Электронный адрес: pogoctss@berezino.gov.by**

УНП 600092490

### О ПОИСКЕ ПРАВООБЛАДАТЕЛЕЙ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

**д. Стайченко**
**Березинского района Минской области**

Погостский сельский исполнительный комитет в целях реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом: Минская область, Березинский район, д. Стайченко, ул. И. Собчука, д. 26 (полный адрес указан согласно похозяйственным книгам).

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках и лицах, имеющих право пользования жилым домом, о месте их фактического проживания, сообщить в Погостский сельисполком по телефонам: **801715 6 43 25, 801715 6 22 33, 801715 6 13 78 (с 8.00 до 17.00 по рабочим дням).** Также информацию можно прислать по адресу: **223320, Минская область, Березинский район, ул. Советская, 4. Электронный адрес: pogoctss@berezino.gov.by**

УНП 600092490

### РУП «Институт недвижимости и оценки»

(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) информирует о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего

**ИХНМ НАН БЕЛАРУСИ** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 24.02.2025**

**Лот № 1:** HYUNDAI SONATA.
Кузов (рама) № KMHEC41BABA132341.
Начальная цена с НДС 20 % – 15 700,00 руб.
Местонахождение: г. Минск, ул. Ф. Скорины, 36.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (gki.gov.by) и на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by)

**Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by** УНП 190055182

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

### ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

***ОРГАНИЗАТОР: КРУГЛИЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ЧАШНИКСКОГО РАЙОНА ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ***

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь | Целевое назначение | Начальная цена (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Д. Хотлино, ул. Набережная, д. 7А | 225182312101000037 | 0,3271 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки) | 6000 | 600 |

1. Аукцион состоится 21 февраля 2025 года в 15.00 по адресу ул. Парковая, д.15 д. Круглица, сельисполком.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (au@gki.gov.by), Витебского областного исполнительного комитета (oblideol3@vitebsk-region.gov.by),Чашникского районного исполнительного комитета (chashrik@vitobl.by)

УНП 300986823